Кантэміраўкай, Валуйкамі і Харкавам (Украіна). Да 1952 на адказных пасадах у ваен. акругах.

**РУДКО́ЎСКАЯ** Алена Рыгораўна (н. 21.4.1973, г. Гомель), бел. спартсменка (плаванне). Засл. майстар спорту Беларусі (1991). Скончыла Гомельскі ун-т (1994). З 2001 трэнер-выкладчык Гомельскага вучылішча алімп. рэзерву. Чэмпіёнка XXV Алімп. гульняў (1992, г. Барселона, Іспанія) на дыстанцыі 100 м брасам; бронз. прызёр у камбінаванай эстафеце 4×100 м. Чэмпіёнка Еўропы (1991, Афіны) на дыстанцыі 100 і 200 м і ў эстафеце; бронз. прызёр (1993, 1994) на дыстанцыі 100 м. Бронз. прызёр Універсіяды (1993, г. Буфала, ЗША) на дыстанцыі 100 м. Чэмпіёнка Спартакіяды народаў СССР (1991) на дыстанцыях 100 і 200 м.







П.М.**Рудкін**.

М.**Рудкоўскі**.

Н.**Руднева** ў ролі прынцэсы Эбалі.

**РУДКО́ЎСКІ** Аляксандр Рыгаравіч (30.10.1943, в. Даўгалессе Гомельскага р-на — 19.12.1999), бел. спявак (лірычны тэнар). Засл. арт. Беларусі (1975). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1971). З 1971 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1986 — Дзярж. акад. нар. аркестра Беларусі імя І.Жыновіча, з 1999 ансамбля нар. музыкі *«Свята»* Бел. філармоніі. Валодаў голасам прыгожага і багатага тэмбру. Выкананню былі ўласцівы душэўная шчырасць, высокая пеўчая культура стылю бельканта. Сярод оперных партый: Ленскі («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Юродзівы («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Берандзей («Снягурка» М.Рымскага-Корсакава), Дон Атавіо («Дон Жуан» В.А.Моцарта), граф Альмавіва («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні), Альфрэд, Герцаг («Травіята», «Рыгалета» Дж. Вердзі), Эрнеста («Дон Паскуале» Г.Даніцэці), Рудольф («Багема» Дж. Пучыні), Фауст («Фауст» Ш.Гуно), Надзір («Шукальнікі жэмчугу» Ж.Бізэ). У рэпертуары бел. нар. песні, песні бел. кампазітараў, рамансы рус. і замежных кампазітараў. Лаўрэат 4-га Міжнар. конкурсу імя П.Чайкоўскага (1970), Міжнар. конкурсу вакалістаў у Барселоне (1975, Іспанія). *Н.Г.Мазурына.*

**РУДКО́ЎСКІ** Міхась (Міхаіл Міхайлавіч; 17.4.1936, в. Востраў Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 7.7.1991), бел. паэт, перакладчык. Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1961). Настаўнічаў. З 1960 у Ганцавіцкай раённай газеце, у 1962—82 на Брэсцкай студыі тэлебачання. Друкаваўся з 1957. Аўтар зб-каў лірыкі «Першыя вёрсты» (1963), «Сінія Брады» (1967), «Позвы» (1971), «У краі тым...» (1975), «Векавечная Бацькаўшчына» (1976), «Трыгор'е» (1981), «Засцярога» (1984). Гал. тэма яго твораў — Беларусь, хараство яе краявідаў, дабрыня, мужнасць і шчырасць людзей, іх надзеі, праблемы і трывогі, мінулае, сучаснае і будучыня. Палессе ў паэзіі Р. паўстае як край казачна-рамантычны, амаль былінны. Вершам Р. уласціва тонкая акварэльнасць малюнка, трапнасць маст. дэталі, светлыя элегічныя інтанацыі роздуму пра ўзаемасувязі прыроды і чалавека, псіхалагізм. Працаваў у жанры балады, элегіі, санета, трыялета і інш. Пераклаў на бел. мову вершы ўкр. паэтаў.

*Тв.*: Залатазвон: Выбр. лірыка. Мн, 1986; Гарынь: Вершы. Мн., 1992.
*Літ.*: Калеснік Зорны спеў. Мн., 1975. *Т.К.Чабан.*

**РУДНАТЭРМІ́ЧНАЯ ПЕЧ**, тое, што *рудааднаўляльная печ.*

**РУ́ДНЕВА** Наталля Аляксандраўна (н. 27.5.1951, г. Самара, Расія), бел. спявачка (мецца-сапрана). Засл. арт. Беларусі (1994). Нар. арт. Беларусі (1999). Скончыла Бел. кансерваторыю (1981). З 1972 артыстка хору, з 1981 салістка Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Валодае моцным голасам, яркім драм. талентам. Першая выканаўца гал. партый у операх бел. кампазітараў: Кветa («Князь Навагрудскі» А.Бандарэнкі), Ганна («Новая зямля» Ю.Семянякі), Клара Цаханасян («Візіт дамы» С.Картэса), а таксама Мадалена («Мадалена» С.Пракоф'ева). Сярод інш. партый: Любка («Сівая легенда» Дз.Смольскага), Любаша, Лель, Вясна («Царская нявеста», «Снягурка» М.Рымскага-Корсакава), Марына Мнішак («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Паліна, Графіня, Вольга, няня («Пікавая дама», «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Канчакоўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Элен Бязухава, Соня, Ахросімава («Вайна і мір» Пракоф'ева), Амнерыс, Эбалі, Ульрыка, Азучэна, Мадалена, Фенена («Аіда», «Дон Карлас», «Баль-маскарад», «Трубадур», «Рыгалета», «Набука» Дж.Вердзі), Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Разіна («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні) і інш.

**РУ́ДНЕЎ** Леў Уладзіміравіч (13.3.1885, г. Ноўгарад, Расія — 19.11.1956), рускі